Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

# Як сябры шукалі настрой вожыка Калючыка

У маляўнічым беларускім лесе жыла-была вавёрачка Адважка. Было ў яе шмат сяброў. Усім яна дапамагала, нікога не крыўдзіла.

Зімовым марозным днём наведалася вавёрачка да сябрука — вожыка Калючыка.

— Тук-тук-тук! — пастукала яна ў дзверы. Але ёй ніхто не адказаў. Яшчэ раз пастукала, а ў адказ — маўчанне.

— Калючык, ты дома? — прыадчыніла дзверы вавёрачка.

— Дома, дома, м-ф-ф, м-ф-ф, — незадаволена зашмыгаў носам звярок.





— Дык чаго не адказваеш, калі дома? Што з табой? — занепакоілася сяброўка.

— Настрой страціў, — буркнуў той.

— Згубіў? — здзівілася вавёрачка.

— Ну, згубіў.

— А якім быў твой настрой?

— Вядома, вясёлым. Ты ж бачыш, які цяпер — сумны, — развёў лапкі ў бакі Калючык.

— Значыць, трэба пашукаць твой добры настрой. Апранайся, пойдзем на вуліцу, калі дома яго няма, — усміхнулася Адважка.

Вожык апрануў сваю калючую шубку, і яны пакрочылі заснежанай сцяжынай.

— Які прыгожы зімовы лес! Проста казка! — усклікнула вавёрачка.

— Лес як лес. Кожны дзень яго бачу, — прабурчаў Калючык.

Ідуць яны, а насустрач бяжыць зайчык Вушасцік.

— Чаго такія панурыя? — спытаў ён.

— Калючык згубіў вясёлы настрой. Мы выйшлі яго шукаць.

— Зразумеў... Я вам дапамагу, — пачухаў вушка зайчык.

— Не знойдзеш, — прабубніў вожык.

— Тады можна купіць, — упэўнена сказаў Вушасцік.

— Купіць настрой? Зай, ты што?! — здзівілася вавёрка Адважка.

— Так, — сцвярджальна сказаў той. — Памятаеш, я купіў табе кветкі і шакаладную шышку? Ты ж так радавалася!

— М-м-м, так, — успомніла сяброўка. — Тады пойдзем у краму.

Ідуць яны ўтрох, а насустрач ляціць сінічка Маняша.

— Прывітанне, Маняша! Як добра, што ты прыляцела!— усклікнуў Вушасцік.

— Цы-фі-пінь-пінь, куды гэта вы сабраліся? — спытала птушачка.

— У краму. Купляць добры настрой для вожыка Калючыка.

— Купляць настрой? — задумалася сінічка.

І тут яна ўспомінала, як яе сяброўка Маша танчыла ад радасці, калі ёй купілі новую сукенку. Сінічка бачыла гэта праз акно.

— Глядзі, Калючык, якая цудоўная, добрая птушачка! Няўжо табе не радасна на яе пазіраць? — раптам усклікнула вавёрка.

— Птушка як птушка. Такіх шмат у лесе, — прабубніў вожык.

— Я спяю песеньку, можа, знойдзецца твой настрой? — закружылася над ім Маняша:

Адзін, два, тры, чатыры, пяць...
Настрой ідзём усе шукаць.
Каб радасць сябру падарыць —
На свеце так дзівосна жыць!

Над намі кружацца сняжынкі,
Зімовай радасці іскрынкі.
І знойдзецца вясёлы ключык —
Ды ўсміхнецца наш Калючык!

— Ля-ля-ля-ля-ля! — танчыла-кружылася вавёрачка.

— Якая цудоўная песенька! — падскочыў зайка Вушасцік.

— Песенька як песенька, — коса зірнуў вожык.

— Калючык, а ты хочаш, каб табе купілі настрой? — спытала сінічка.

Вожык упарта маўчаў.

— Думаю, што настрой яму не купіш. Я ведаю, бываюць такія сітуацыі ў людзей. Гэта называецца дэпрэсія, — мудра разважала Маняша.

— І што нам цяпер рабіць? — апусціў вушкі зайчык.

— Спытаць, чаго жадае сам вожык, — адказала сінічка.





— Калючык, што ты хочаш? Ад чаго табе зробіцца весела, знойдзецца твой настрой? — спытала вавёрка Адважка.

— Я хачу спаць. Усе мае знаёмыя вожыкі даўно спяць, а не шукаюць прыгоды і настрой, — адказаў Калючык.

— Дык у чым справа?! — выгукнулі ў адзін голас сябры.

— Мы і цябе пакладзём спаць, — выпрастаў вушкі зайчык.

— А як жа Новы год? Вы будзеце яго сустракаць, падарункі ад Дзеда Мароза атрымаеце, а я буду спаць?

— Мы цябе разбудзім, — падскочыла да вожыка вавёрачка Адважка.

— Згодзен! — узрадаваўся вожык.

— Вось і наш Калючык павесялеў, — заўважыла сінічка Маняша і заспявала сваю песеньку.

Сябры адправіліся да вожыка. А сам ён не ішоў, а бег, падскокваючы.

— Вушасцік, усё ж знайшоўся добры настрой Калючыка, — шапнула Адважка.

— Так, — згодна кіўнуў галавой зайчык.

Ён радасна пазіраў на вожыка, які разам з сінічкай спяваў песеньку.

Неўзабаве звяркі спыніліся каля вожыкавай хаткі.

— Калючык, мы жадаем табе салодкага сну! — падскочыла вавёрка Адважка.

— Бяжы ў свой домік і засынай, — дадаў заяц Вушасцік.

— Пінь-пінь, няхай табе сняцца каляровыя сны, — пажадала сінічка Маняша.

— Дзякуй вам, толькі абавязкова разбудзіце мяне на Новы год, — папрасіў вожык, памахаў лапкай і пайшоў адпачываць.

— Разбудзім! Не забудзем! — гучна паабяцалі сябры.

*Малюнкі*
*Анастасіі СЛІЖУК*

